Установа адукцыі
"Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт"

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце ўстановы адукацыі "Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт"
_________А.П.Бяценя
"_17_" _кастрычніка_ 2023 г.
Рэгістрацыйны № УД-_______-І/вуч.

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНАЙ

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне
па адукацыйнай праграме навучальных курсаў:
"Сучасная беларуская мова для замежных студэнтаў"

2023 г.

Вучэбная праграма распрацавана на аснове вучэбных планаў УА "Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт" па адукацыйнай праграме навучальных курсаў “Сучасная беларуская мова для замежных студэнтаў”, зацведжанных 08.09.2023, 22.09.2023.

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

Бурдзялёва І.А., дацэнт кафедры беларускай мовы і літаратуры ўстановы адукацыі “Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
Воінава-Страха М.М., загадчык кафедры беларускай мовы і літаратуры ўстановы адукацыі “Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт”, кандыдат філалагічных навук;

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай беларускай мовы і літаратуры ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт»
(пратакол № 13 ад 30.06.2023);

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі
«Мінскідзяржаўнылінгвістычны ўніверсітэт»
(пратакол № 1 ад 17.10.2023).

# І. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Беларуская літаратура ў кантэксце сусветнай» з’яўляецца састаўной часткай лінгвістычнай падрыхтоўкі перакладчыкаў, выкладаецца ў адпаведнасці з агульнымі мэтамі падрыхтоўкі перакладчыкаў, якія прадугледжваюць фарміраванне і развіццё сацыяльна-прафесійнай і практыка-арыентаванай кампетэнтнасці.

**Мэта** вывучэння вучэбнай дысцыпліны – фарміраванне сістэмы ведаў пра заканамернасці развіцца літаратуры Беларусі ў кантэксце агульнаславянскага і агульнаеўрапейскага літаратурна-культурнага ўзаемадзеяння.

Асноўнымі **задачамі** вывучэння вучэбнай дысцыпліны з’яўляюцца:

- фарміраванне навыкаў самастойнага аналізу твора з улікам яго ідэйна-мастацкай цэласнасці ў гісторыка-літаратурным кантэксце;
- фарміраванне сістэмы ведаў па гісторыі беларускай літаратуры XI–XXI стст., яе ідэйна-мастацкіх асаблівасцях, жанравай сістэмы, нацыянальнай спецыфікі і месца ў сусветным літаратурным працэсе.
- азнаямленне з асноўнымі прынцыпамі літаратуразнаўчай кампаратывістыкі і герменеўтыкі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Беларуская літаратура ў кантэксце сусветнай» студэнты павінны

*ведаць:*

– асаблівасці літаратурнага развіцця беларускай літаратуры ў сусветным кантэксце;
– асноўныя гісторыка-культурныя эпохі цывілізацыйнага развіцця і іх спенцыфічныя праявы ў беларускай літаратуры;
– літаратурныя напрамкі, плыні, мастацкія метады, якія знайшлі сваё ўвасабленне ў мастацкіх творах гэтага перыяду;
– асноўныя прынцыпы літаратуразнаўчай кампаратывістыкі і герменеўтыкі;
– праблематыку, ідэйны змест, асаблівасці кампазіцыі і вобразна-выяўленчыя сродкі;
– асаблівасці творчай індывідуальнасці класікаў беларускай літаратуры, іх творчыя прыярытэты, месца ў сусветнай літаратуры;
– тыпалагічна і кантактна блізкія праявы літаратурнага жыцця Беларусі і свету;
– жанры і стылі літаратуры;
– творчую гісторыю найбольш значных мастацкіх тэкстаў;
– літаратуразнаўчыя працы, прысвечаныя беларускай літаратуры і праблемам параўнальнага літаратуразнаўства;
– нацыянальнае і агульначалавечае значэнне мастацкіх твораў.

*умець:*

– арыентавацца ў гісторыі развіцця беларускай літаратуры ў сусветным кантэксце;

- сістэматызаваць і абагульняць фактычны матэрыял, які адлюстроўвае асаблівасці літаратуры розных гістарычных перыядаў;
- характарызаваць творчасць класікаў і выбітных прадстаўнікоў беларускай літаратуры, ацэньваць іх мастацкія адккрыцці, значныя для сусветнага літаратурнага працэсу, іх мастацкі ўклад у сусветную літаратурную класіку;
- даваць характарыстыку мастацкім эпохам, кірункам, стылям, жанрам у сусветнай і беларускай літаратуры, бачыць месца беларускіх аўтараў і твораў у сусветным літаратурным працэсе;
- працаваць з навуковай літаратурай і крыніцамі;
- аналізаваць твор з улікам яго ідэйна-мастацкай цэласнасці ў гісторыка-літаратурным кантэксце;

*валодаць:*

- навыкамі літаратуразнаўчага, кампаратывісцкага, герменеўтычнага аналізу мастацкіх тэкстаў;
- тэарэтычнымі ведамі для вывучэння канкрэтных мастацкіх твораў, неабходнымі для аналізу твораў катэгорыямі, паняццямі, тэрмінамі літаратуразнаўства.

У адпаведнасці з вучэбнымі планамі УА "Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт" па адукацыйнай праграме навучальных курсаў “Сучасная беларуская мова для замежных студэнтаў” агульная колькасць гадзін, адведзеных на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Беларуская літаратура ў кантэксце сусветнай”, складае 72 гадзіны, з іх колькасць аўдыторных гадзін складае 34 гадзіны (10 гадзін лекцыйных, 24 гадзіны семінарскіх заняткаў). Самастойная праца студэнтаў плануецца ў аб’ёме 38 акадэмічных гадзін.

Вучэбная дысцыпліна вывучаецца на працягу аднаго семестра.

Формай прамежкавай атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне з’яўляецца залік. Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 2 заліковыя адзінкі.

Вучэбная дысцыпліна вывучаецца на беларускай мове.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – вочная (дзённая).